# СТАТУТ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА 1529 ГОДА ЯК КВІНТЭСЭНЦЫЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАГА І ПРАВАВОГА ЖЫЦЦЯ ТАГАЧАСНАГА БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСТВА

**Дз. С. Жук**
*выкладчык агульнавайсковай кафедры ваеннага факультэта*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск, Беларусь*

У артыкуле разглядаюцца палажэнні Статута 1529 г., якія былі ўключаны ў яго, як вынік уплыву тых падзей і працэсаў, што папярэднічалі яго выданню і сталі адлюстраваннем грамадска-палітычнага і прававога жыцця ВКЛ.

В статье рассматриваются положения Статута 1529 года, которые были включены в него, как результат влияния тех событий и процессов, которые предшествовали его изданию и стали отражением общественно-политической и правовой жизни ВКЛ.

The article discusses the provisions of the Statute of the Grand Duchy of Lithuania 1529, which were included in it, as a result of the influence of those events and processes that preceded its publication and became a reflection of the socio-political and legal life of the Grand Duchy of Lithuania.

XVI ст. для ВКЛ пачалося трагічна. Прычынай гэтаму сталі, пачынаючы з 1492 г., калі памёр вялікі князь Казімір Ягайлавіч, пастаянныя абарончыя войны супраць Маскоўскага княства, што суправаджалася стратай вялікіх тэрыторый, спусташэннямі воласцяў і знішчэннем гарадоў. Ускладнялася становішча і барацьбой з крымскімі татарамі, якія былі разгромлены ў бітве пад Клецкам у 1506 г., гэта была першая буйная перамога ВКЛ над крымскім войскам.

Асобна стаіць вядомая бітва пад Воршай, якая адбылася 8 верасня 1514 г., дзе войска ВКЛ разбіла ў разы пераўзыходзячую па колькасці армію Маскоўскага княства. Аршанская бітва ўвайшла ў гісторыю, як адна з найбуйнейшых у Еўропе XVI стагоддзя. Бліскучая перамога нашага войска, узначаленае вялікім гетманам Канстанцінам Астрожскім, аддала ініцыятыву вайны ў рукі ВКЛ, стала сімвалам гісторыі беларускага народа, надала імпульс фарміраванню беларускай дзяржаўнасці з яе палітычнай і прававой сістэмамі.

Неўзабаве працягам знакавых падзей стала 6 жніўня 1517 г., калі ў Празе свет пабачыла першая друкаваная беларуская кніга – «Псалтыр». Надрукаваў яе беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар – Ф. Скарына. Дзякуючы яго дзейнасці, Беларусь была далучана да агульнаеўрапейскай цывілізацыйнай сям’і. Ён стаў сапраўдным волатам еўрапейскага Адраджэння.

Наступнай значнай падзеяй у жыцці нашага народа стала паэма М. Гусоўскага «Песня пра зубра», якая выйшла ў свет у 1523 г. Выдатны беларускі паэт-лацініст стварыў выдатны гімн сваёй роднай зямлі, яе прыродзе, душы народу, паказаў ВКЛ як еўрапейскую дзяржаву, апору Еўропы ў барацьбе з турэцка-татарскай пагрозай.

Усё гэта папярэднічала такой знакавай падзеі, як выданне Статута Вялікага Княства Літоўскага 1529 года. Нажаль дакладна невядома хто ўдзельнічаў у яго падрыхтоўцы. Прафесар Я.А. Юхо выказваў меркаванні адносна таго, што адным з распрацоўшчыкаў Статута ВКЛ 1529 г. з'яўляўся Ф. Скарына, які меў ступень доктара права [3, с. 126]. Яго думку раздзяляе прафесар Т. І. Доўнар [1, с. 92]. Па яе заўважанню крыніцамі пры распрацоўцы Статута 1529 г. з'яўляліся: мясцовае звычайнае права, адміністрацыйная і судовая практыка дзяржаўных органаў, нормы пісанага права, выкладзеныя ў Судзебніку 1468 г. і раней прынятых граматах, нормы царкоўнага права, нормы старажытных крыніцаў і замежнага права [1, с. 92]. Статут складаўся з 13 раздзелаў і ўтрымліваў нормы дзяржаўнага, адміністратыўнага, зямельнага, крымінальнага, грамадзянскага, сямейнага, працэсуальнага і іншых галін права [3, с. 128]. Ён па сапраўднаму стаў адным з сімвалаў беларускай дзяржаўнасці. Выданне гэтага статута сведчыла аб намаганнях стварыць адзінае сістэматызаванае для ўсёй дзяржавы пісанае права. Такое жаданне было абумоўлена неабходнасцю цэнтралізацыі ўлады ў краіне, павышэнні ўзроўню апаратыўнага кіравання ёю, хуткасці і якасці прымаемых дзяржаўных рашэнняў і выкананні задач дзяржаўнай важнасці. Усё гэта з'ялялася жыццёва неабходным каб заставацца канкурэнтаздольнымі на міжнароднай арэне і ў сферы знешняй палітыкі. Сведчаннем гэтаму служаць некаторыя артыкулы статута.

Асабліва важным з'яўляецца ўключэнне ў Статут 1529 г. палажэння аб тым, што ўсе людзі ў ВКЛ павінны судзіцца па аднаму праву, пры чым незалежна ад прыналежнасці да беднага або багатага стану (Статут 1529. Р. І, арт. 9) [2, с. 135]. Асобнае месца займае 19 артыкул першага раздзела, ў якім Вялікі князь гарантаваў захаванне ў феадалаў тых зямель, якія былі імі атрыманы (падараваны або пажалаваны ім) пры княжанні папярэдніх князёў [2, с. 138–139]. Не менш важным з'яўляецца ўключэнне ў статут нормы аб пакаранні асобы якая не падпарадкоўваецца або не выконвае пастанову Вялікага князя, прымаемую разам з радай (Статут 1529. Р. І, арт. 23) [2, с. 140]. Яшчэ адным адметным палажэннем было замацаванне забароны для Вялікага князя нікому нічога на тэрыторыі ВКЛ не жалаваць і пацвярджаць прывілеі ў той час, калі ён знаходзіўся ў Польшчы. Пры гэтым граматы

на валоданне нерухомасцю ў дзяржаве павінны былі прымацца толькі разам з панамі раднымі на вальным сойме (Статут 1529. Р. І, арт. 25) [2, с. 140–141].

Прыведзеныя прыклады артыкулаў Статута ВКЛ 1529 г. сведчылі аб тым, што на вышэйшым дзяржаўным узроўні ішла актыўная праца накіраваная на кансалідацыю намаганняў па стварэнню жыццяздольнай палітыка-прававой сістэмы грамадства, якая б улічвала тагачасныя выклікі дзяржаўнай самастойнасці, незалежнасці і суверэнітэту ВКЛ.

Улічваючы склаўшуюся на пачатак XVI ст. цяжкую міжнародную абстаноўку і вайсковую пагрозу для ВКЛ з боку Маскоўскага княства і крымскіх татар, другі раздзел Статута 1529 г. быў прысвечаны пытанням земскай абароны і стаў своеасаблівым адказам на выклікі таго часу.

Ужо ў першым артыкуле другога раздзела мы бачым замацаваны абавязак несці вайсковую павіннасць. Тычыўся ён прадстаўнікоў шляхецкага саслоўя [2, с. 142–143]. У другім артыкуле гэтага ж раздела вялікі князь прыказвае збірацца ўсім ваеннаабавязаным асобам пад павятовымі харугвамі (сцягамі) і праходзіць вайсковы агляд і інш. [2, с. 143]. Артыкул 7 прадугледжваў абавязак гетманаў фіксаваць усе выпадкі спазнення на вайсковую службу без якой-небудзь на гэта паважнай прычыны [2, с. 145]. Згодна з артыкулам 11 ніхто без дазволу гетмана не павінен пакідаць вайсковую службу пакуль войска не будзе распушчана, у адваротным выпадку такую асобу чакае канфіскацыя яго маёнтка, так быццам бы ён не быў на вайне [2, с. 146].

Як можам мы бачыць у другім раздзеле Статута 1529 г. былі замацавы нормы, якія павінны былі прывесці ваенную арганізацыю ВКЛ у поўны парадак і надаць ёй стройную арганізацыю і садзейнічаць пастаяннай баяздольнасці дзяржавы, асабліва ў абставінах узраставўшай у той час вайсковай пагрозы з боку суседніх дзяржаў.

Таксама важным з'яўляюцца і артыкулы трэцяга раздзела Статута ВКЛ 1529 г. У першым з іх вялікі князь дае абавязак ВКЛ і паноў рады ні ў чым не прыніжаць [2, с. 148]. Адным з найбольш важных з'яўляецца другі артыкул, згодна з ім Вялікі князь абязуецца ўладанні ВКЛ не памяншаць, а што будзе несправядліва захоплена, адабрана, вярнуць назад у склад ВКЛ [2, с. 148]. Трэцім артыкулам устанаўліваўся абавязак не даваць чужаземцам ва ўласнасць землі, замкі, гарады, якія-небудзь званні і пасады ў ВКЛ [2, с. 148]. У шостым і семым артыкулах вялікі князь пацвярджае папярэднія заканадаўчыя акты, а новыя абяцае прымаць з мэтай карысці для дзяржавы і толькі з дазволу паноў рады, абяцае ўсіх феадалаў, мяшчан і іх людзей захоўваць пры свабодах і вольнасцях, дадзеных ім (гаспадаром) і яго папярэднікамі [2, с. 149].

У трэцім раздзеле знаходзіліся нормы абапіраючыся на якія прадстаўнікі правячага саслоўя на заканадаўчы ўзровень узводзілі абавязак Вялікага князя адстойваць суверэнітэт, тэрытарыяльную цэласнасць і дзяржаўную незалежнасць ВКЛ. Добра асазнаючы ўсю складанасць знешнепалітычнага становішча ВКЛ зрабіла актуальным уключэнне менавіта такіх норм у тэкст статута.

Да спробы стварыць адзіную для ўсёй краіны судовую сістэму, якая павінна дзейнічаць у адпаведнасці з нормамі аднолькавага для ўсіх права, адносіцца першы артыкул шостага раздзела, які замацоўвае прынцып усеагульнасці права. Службовыя асобы дзяржавы і суддзі абавязваюцца ў сваёй дзейнасці карыстацца толькі пісаным законам. У выпадку неўрэгуляванасці нормамі Статута тых ці іншых грамадскіх адносін, дазваляецца дзейнічаць у адпаведнасці са звычаямі, аднак з умовай, што пазней на сойме новая норма павінна быць прынята [2, с. 165–166].

Нельга абысці стараной і той факт, што Статут 1529 г. быў выдадзены на беларускай мове. Тым самым у ім замацаваліся поспехі тагачаснай беларускай культуры, у першую чаргу пачатак беларускага кнігадрукавання непасрэдна звязаны з дзейнасцю Ф. Скарыны, творчая дзейнасць М. Гусоўскага і інш. Разам з тым у статуце было юрыдычна замацавана прывілеяванае становішча класа феадалаў.

Такім чынам выданне Статута 1529 г. стала важным крокам наперад, які паказаў усяму цывілізаванаму свету інтэлектуальную сталасць тагачаснага феадальнага беларускага грамадства. Ён утрымліваў у сабе нормы, якія былі ўключаны ў яго ў якасці рэакцыі на тыя падзеі і выклікі з якімі сутыкнуліся нашы продкі.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. Доўнар Т.І. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : вучэбнае выданне / Т. І. Доўнар. Мінск : Амалфея, 2007. 400 с.
2. Статут Великого Княжества Литовского 1529 года / под ред. К. И. Яблонскиса. Минск : Акад. наук Белорус. ССР, 1960. 253 с.
3. Юхо Я.А. Статуты Вялікага княства Літоўскага // Полымя. 1966. № 11. С. 125–137.